*Серыя «Noblesse Oblige»*

Жазэ Сарамагу

# ПЯЧОРА

Раман

*Пераклала з партугальскай*
*Галіна Мітраховіч*

Мінск
Выдавец А. М. Янушкевіч
2019

*Прысвячаю Пілар*

Дзіўны ты апісваеш вобраз і дзіўных вязняў,
Падобных да нас.

*Платон, «Дзяржава», кніга VII*

Мужчыну, што кіруе фургонам, завуць Сіпрыяну Алгор, па прафесіі ён ганчар, і яму шэсцьдзясят чатыры гады, хаця выглядае маладзейшым. Мужчыну, які сядзіць побач, яго зяця, завуць Марсал Гашу, гэтаму яшчэ няма трыццаці. Прынамсі, ніхто б яму столькі не даў, паглядзеўшы на твар. Як ужо можна было заўважыць, і ў аднаго, і ў другога побач з імем стаіць не зусім звычайнае прозвішча, пра якое не вядома, што яно значыць, адкуль узялося і навошта. Хутчэй за ўсё, ім было б не вельмі прыемна калі-небудзь даведацца, што «алгор» азначае вялікі холад па целе, прадвеснік ліхаманкі, а «гашу» не што іншае, як тая частка шыі вала, на якую вешаюць ярмо. Маладзейшы ва ўніформе, але без зброі. На старэйшым цывільны пінжак і штаны больш-менш у тон пінжака, кашуля строга зашпіленая на апошні гузік, але без гальштука. Рукі, якія круцяць стырно, вялікія і моцныя, сялянскія, але, магчыма, дзякуючы штодзённаму кантакту з мяккай глінай, да якога абавязвае рамяство, здаюцца чуллівымі. На правай руцэ Марсала Гашу няма нічога асаблівага, а вось на тыльным баку левай шрам, падобны да апёку, дыяганальная меціна, што цягнецца ад пачатку вялікага пальца да пачатку мезенага. Фургон не заслугоўвае гэтай назвы, гэта хутчэй фургончык, сярэдніх памераў, састарэлай мадэлі, і вязе ён гліняны посуд. Калі абодва мужчыны выехалі з дому, да якога ўжо дваццаць кіламетраў, неба толькі-толькі пачынала святлець, а цяпер раз'яснілася настолькі, што можна разгледзець шрам Марсала Гашу і здагадацца пра чуллівасць

рук Сіпрыяну Алгора. Едуць яны на паніжанай хуткасці, бо груз крохкі, а дарожнае пакрыццё няроўнае. Тавар, што не лічыцца першай ці другой неабходнасцю, як у выпадку самаробнага глінянага посуду, па раскладзе завозіцца каля дзесяці гадзін раніцы, а гэтыя двое выехалі на досвітку, бо Марсал павінен заступіць на працу не пазней чым за паўгадзіны да адкрыцця Цэнтра для наведвальнікаў. У дні, калі Сіпрыяну Алгор не падвозіць зяця, але павінен везці посуд, яму няма патрэбы ўставаць так рана. І ўсё ж раз на дзесяць дзён менавіта ён забірае Марсала Гашу з працы, каб той мог пабыць з сям'ёю сорак вольных гадзін, што належаць яму па праве, а пасля, з посудам ці без посуду ў кузаве фургона, зноў пунктуальна адвозіць зяця да яго павіннасцей і абавязкаў унутранага ахоўніка. Дачка Сіпрыяну Алгора, якая завецца Мартай і мае прозвішча Ізашка ад нябожчыцы-маці і Алгор ад бацькі, цешыцца прысутнасцю мужа ў хаце і ў ложку толькі шэсць начэй і тры дні кожнага месяца. Папярэдняе ночы яна зацяжарала, але яшчэ не ведае гэтага.

Мясцовасць бляклая, брудная, больш чым аднаго позірку не заслугоўвае. Хтосьці даў гэтым прасторам зусім не сельскага выгляду тэхнічную назву Сельскагаспадарчы пояс, а таксама, па нейкай паэтычнай аналогіі, Зялёны пояс, хаця адзіны пейзаж, які вока можа ахапіць паабапал дарогі і які бесперапынна цягнецца на многія тысячы гектараў, гэта вялізныя каркасы з плоскім дахам, прамавугольныя, зробленыя з пластыку нейтральнага колеру, што час і пыл патроху зрабілі шэра-бурым. Унутры іх, удалечыні ад вачэй мінакоў, нейкія расліны. Там і сям, па другасных дарогах, што выходзяць на галоўную, едуць нагружаныя гароднінай грузавікі і трактары з прычэпамі, хаця большасць перавозак ажыццявілі ўначы, а гэтыя, цяперашнія, або маюць яўны і выключны дазвол на пазнейшую дастаўку, або праспалі. Марсал Гашу незаўважна падцягнуў левы рукаў пінжака, каб глянуць на гадзін-

нік, ён хвалюецца, бо рух на дарозе паступова нарастае, а ён ведае, што далей, пасля заезду ў Прамысловы пояс, цяжкасцей будзе больш. Цесць заўважыў жэст, але змаўчаў, гэты яго зяць, без сумнення, хлопец прыемны, але ж нервовы, з пароды неспакойных ад нараджэння, заўжды сочыць за ходам часу, нават калі яго не бракуе, і тады ён не ведае, што ў яго ўкласці, у час, зразумела. Які ж ён будзе, калі дажыве да маіх гадоў, мільганула думка. Сельскагаспадарчы пояс застаўся ззаду, дарога, цяпер бруднейшая, перасякае Прамысловы пояс, ідучы сярод фабрычных пабудоў рознага памеру, прызначэння і выгляду, са сферычнымі і цыліндрычнымі паліўнымі рэзервуарамі, электрастанцыямі, каналізацыйнымі сеткамі, паветраправодамі, вісячымі мастамі, трубамі самай рознай таўшчыні, адны чырвоныя, іншыя чорныя, трубамі, што выкідваюць у атмасферу воблакі атрутнага дыму, сярод даўгарукіх пад'ёмных кранаў, хімічных лабараторый, нафтаачышчальных заводаў, смярдзючых, горкіх або саладжавых пахаў, прарэзлівых гукаў свярдзёлкаў, гудзення механічных піл, гулкіх удараў палевых молатаў, калі-нікалі трапляецца і бясшумная зона, ніхто не ведае, што вырабляюць там. І тут Сіпрыяну Алгор прамовіў, Не турбуйся, прыедзем без спазнення, Я не турбуюся, адказаў зяць, ледзь хаваючы хваляванне, Ведаю-ведаю, я проста так сказаў, вымавіў Сіпрыяну Алгор. Скіраваў фургон на паралельную вуліцу, прызначаную для мясцовага руху, Зрэжам тут, сказаў, калі паліцыя спытае, чаму з'ехалі з дарогі, памятай пра ўмову, да ўезда ў горад нам трэба вырашыць справу на адной з гэтых фабрык. Марсал Гашу глыбока ўздыхнуў. Калі рух на дарозе ўскладняўся, цесць раней ці пазней ехаў у аб'езд. Марсала трывожыла толькі тое, што той забудзецца і прыме такое рашэнне занадта позна. На шчасце, нягледзячы на страхі і перасцярогі, паліцыя ні разу не загадала ім спыніцца, Калі-небудзь да яго дойдзе, што я ўжо не хлопчык, падумаў Марсал, і няма па-

трэбы нагадваць мне кожны раз пра справы на фабрыках. Ні адзін, ні другі не думаў, што якраз уніформа ахоўніка Цэнтра на Марсале Гашу была прычынай заўсёднай цярпімасці або прыхільнай абыякавасці дарожнай паліцыі, усё гэта не было проста шчаслівай выпадковасцю ці нязменным шанцаваннем, хаця менавіта так абодва адказалі б на пытанне, чаму, на іх думку, іх дагэтуль не аштрафавалі. Калі б Марсал Гашу ведаў пра гэта, то, магчыма, звярнуў бы ўвагу цесця на вагу аўтарытэту, які надавала яму ўніформа, калі б Сіпрыяну Алгор ведаў пра гэта, то, магчыма, не стаў бы размаўляць з зяцем з такой іранічнай паблажлівасцю. І праўда, ні маладосць не ведае таго, што можа, ні старасць не можа таго, што ведае.

Пасля Прамысловага пояса пачынаецца горад, дакладней, не зусім яшчэ горад, той віднеецца наперадзе, пяшчотна кранутым першым ружовым святлом сонца, тут жа бачнае хаатычнае нагрувашчванне баракаў, збудаваных з усіх магчымых, збольшага маланадзейных, матэрыялаў, абы толькі баранілі ад непагадзі, галоўным чынам ад дажджу і холаду, сваіх беспрытульных насельнікаў. Гэта, як кажуць гараджане, жахлівае месца. Час ад часу, у пацвярджэнне класічнай аксіёмы, якая кажа, што патрэба таксама чыніць закон, тут здараюцца напады на гружаную прадуктамі фуру, якую апаражняюць як вокам маргнуць. Метад дзеяння, вельмі эфектыўны, быў прыдуманы і распрацаваны пасля грунтоўнага калектыўнага абмеркавання вынікаў першых спроб, што не ўдаліся, як гэта адразу стала відавочна, праз поўную адсутнасць стратэгіі, праз састарэлую тактыку, калі яе можна так назваць, і, нарэшце, праз недастатковую і бязладную каардынацыю высілкаў, якія насамрэч не былі супольнымі. Паколькі цягам ночы дарожны рух быў амаль бесперапынны, перакрыццё дарогі з мэтай затрымаць які-небудзь грузавік, як хацелі спачатку, значыла для рабаўнікоў трапіць у сваю ж пастку, бо адразу за першым ішлі іншыя грузавікі, а гэта цяг-

нула за сабой падмацаванне і хуткае выратаванне кіроўцы, якога напаткала бяда. Рашэнне праблемы, сапраўды геніяльнае, як цішком прызнавалі самі паліцэйскія органы, заключалася ў падзеле рабаўнікоў на дзве групы, адну тактычную, другую стратэгічную, і ўстаноўцы дзвюх загарод замест адной, як толькі які-небудзь грузавік з'яўляўся на пэўнай адлегласці ад іншых, тактычная група пачынала хуценька перакрываць дарогу за ім, а стратэгічная за некалькі соцень метраў наперадзе, папярэджаная спецыяльным светлавым сігналам, з такой жа хуткасцю ўсталёўвала другую загароду, і па волі лёсу машыне не заставалася нічога іншага, як спыніцца і аддацца на рабаванне. Што датычылася грузавікоў, якія ехалі ў зваротным напрамку, перакрываць ім дарогу не было патрэбы, бо іх кіроўцы самі спыняліся, скеміўшы, што адбываецца наперадзе. І трэцяя, названая групай хуткага рэагавання, адказвала за тое, каб градам камення адбіць у любога смельчака ахвоту праявіць салідарнасць. Загароды рабіліся з ладных камянёў, якія дастаўлялі на насілках, пры гэтым некаторыя рабаўнікі богам кляліся, што не маюць ніякага дачынення да здарэння і прыходзілі, каб дапамагчы ссунуць каменне на ўзбочыну, Праз тых людзей пра наш раён ходзіць дрэнная слава, а мы сумленныя, казалі яны, на што кіроўцы іншых грузавікоў, якія прагнулі толькі вольнай дарогі, каб не спазніцца ў Цэнтр, адказвалі коратка, Ну-ну. Фургончык Сіпрыяну Алгора пазбегнуў такіх дарожных здарэнняў, таму што амаль заўсёды праязджае гэтыя месцы пры дзённым святле. Прынамсі, да сённяшняга дня. І праўда, паколькі гліняны посуд часцей можна ўбачыць на стале бедняка і ён хутчэй б'ецца, ганчар не выключае, што адна кабета з тых, якія неяк існуюць у гэтых бараках, аднойчы нагадае галаве сям'і, Нам патрэбныя новыя талеркі, на што той, без сумнення, адкажа, Гэта мой клопат, там калі-нікалі праязджае фургончык з надпісам *Ганчарныя вырабы*, няўжо ж не возіць та-

леркі, І гаршкі, дадасць кабета, скарыстаўшы спрыяльны момант, І гаршкі, я не забуду.

Паміж баракамі і першымі гарадскімі будынкамі, на нічыйным кавалку, што раздзяляе дзве варожыя фракцыі, ляжыць ладная незабудаваная тэрыторыя, аднак прыгледзеўшыся больш уважліва, на зямлі можна заўважыць сетку перакрыжаваных трактарных слядоў, пэўныя роўныя ўчасткі, дзе, відавочна, папрацавалі вялікія механічныя лапаты, гэтыя няўмольныя крывыя лёзы, якія бязлітасна зносяць усё перад сабой, стары дом, малады корань, ахоўную сцяну, цяністы куток, якога ніколі больш не будзе. Тым не менш, як бывае часам у жыцці, калі мы думаем, нібыта ўсё наша знеслі, а потым заўважаем, што ўсё ж такі нешта засталося, так і тут раскіданыя аскепкі, брудныя анучы, рэшткі нейкіх матэрыялаў, іржавыя бляшанкі, згнілыя дошкі, кавалак поліэтылену, што вецер ганяе туды і сюды, сведчаць, што раней гэтую тэрыторыю займалі бедныя кварталы. Неўзабаве гарадскія будынкі насунуцца, як шарэнга стралкоў, і завалодаюць зямлёю, пакінуўшы паміж сабой і першымі баракамі толькі вузкую палоску, новую нічыйную зямлю, якая будзе заставацца такой, пакуль не надыдзе момант пераходу да трэцяй фазы.

Галоўная дарога, на якую яны вярнуліся, пашырылася за кошт паласы, прызначанай выключна для грузавога транспарту, і хаця толькі хваравітае ўяўленне можа аднесці фургончык да гэтай катэгорыі, той факт, што ён бясспрэчна з’яўляецца транспартам для перавозкі грузаў, надзяляе яго кіроўцу правам сапернічаць на роўных з павольнымі фурамі-мастадонтамі, якія храпуць, рыкаюць і выплёўваюць з выхлапных трубаў задушлівыя воблакі, і хутка абганяць іх спрытным манеўрам, ад якога там, ззаду, дзынкае посуд. Марсал Гашу яшчэ раз зірнуў на гадзіннік і ўздыхнуў. Прыедзе своечасова. Яны ўжо былі на перыферыі горада, заставалася яшчэ праехаць некалькімі вуліцамі блытанай планіроўкі, павярнуць налева,

павярнуць направа, зноўку налева, зноўку направа, цяпер направа, направа, налева, налева, направа, наперад і ўрэшце выехаць на плошчу, пасля якой усім складанасцям канец, бо адтуль прамы праспект прывядзе да іх месца прызначэння, туды, дзе чакаюць унутранага ахоўніка Марсала Гашу, і туды, дзе ганчар Сіпрыяну Алгор пакіне свой груз. Удалечыні дарогу перарэзвала высачэзная цёмная сцяна, нашмат вышэйшая за самы высокі з будынкаў паабапал праспекта. На самай справе яна дарогу не перарэзвала, такое ўражанне стварала аптычная ілюзія, бо там былі вуліцы, якія ішлі ў абодвух напрамках уздоўж сцяны, што, у сваю чаргу, была зусім не сцяной, а часткай вялізнай структуры, гіганцкай прамавугольнай будыніны без вокнаў на гладкім фасадзе, аднолькавай на ўсім працягу. Вось мы і тут, сказаў Сіпрыяну Алгор, як бачыш, прыехалі своечасова, яшчэ дзесяць хвілін да таго, як табе заступаць, Вы ведаеце не горш за мяне, чаму я не магу спазняцца, гэта б адмоўна адбілася на маёй чарзе ў спісе кандыдатаў на месца ахоўніка з правам пражывання, Ідэя стаць ахоўнікам з правам пражывання не з ліку тых, якія б маглі ўзрадаваць тваю жонку, Так будзе лепш для нас, будзе больш выгод, лепшыя ўмовы жыцця. Сіпрыяну Алгор спыніў фургон на рагу будыніны, здавалася, што ён нешта адкажа зяцю, але замест гэтага спытаў, А чаму зносяць той квартал, Значыць, пацвердзілася, Што пацвердзілася, Ужо некалькі тыдняў хадзілі чуткі пра пашырэнне, адказаў Марсал Гашу, выходзячы з фургона. Яны спыніліся перад дзвярыма, над якімі была шыльда са словамі «Службовы ўваход для персаналу аховы». Сіпрыяну Алгор сказаў, Можа і так, Не можа, а так, доказ перад вачыма, знос ужо пачалі, Я меў на ўвазе не пашырэнне, а тое, што ты раней сказаў пра ўмовы жыцця, пра выгоды я спрачацца не буду, як бы там ні было, нам няма чаго скардзіцца, мы не самыя бедныя, Паважаю вашу думку, але маю сваю, пабачыце, што, як надыдзе час, Марта па-

годзіцца са мною. Зрабіў пару крокаў, спыніўся, відавочна падумаў, што не так трэба зяцю развітвацца з цесцем, які падвёз яго на працу, і сказаў, Дзякуй, жадаю вам добрай зваротнай дарогі, Да сустрэчы праз дзесяць дзён, сказаў ганчар, Да сустрэчы праз дзесяць дзён, сказаў унутраны ахоўнік, адначасова кіўнуўшы калегу, які набліжаўся да іх. Пайшлі разам, увайшлі, дзверы зачыніліся.

Сіпрыяну Алгор завёў рухавік, але крануўся з месца не адразу. Кінуў позірк на будынкі, якія ішлі пад знос. Гэтым разам, мабыць, праз малую іх вышыню, абыходзіліся без узрывання, гэтага сучаснага, хуткага і відовішчнага працэсу, які за тры секунды здольны ператварыць трывалую арганізаваную канструкцыю ў хаатычную кучу аскепкаў. Як і чакалася, вуліца, якая ўтварала прамы вугал з гэтай, была закрытая для руху. Каб здаць тавар, ганчару трэба было выехаць з квартала, які зносілі, абагнуць яго, потым скіравацца проста, патрэбныя дзверы былі на самым аддаленым рагу адносна месца яго знаходжання, на іншым канцы ўяўнай прамой, якая б перасекла наўскасяк будынак, куды ўвайшоў Марсал Гашу. Па дыяганалі, у думках удакладніў ганчар, каб скараціць тлумачэнне. Калі праз дзесяць дзён ён прыедзе сюды па зяця, ад гэтых будынкаў не застанецца і следу, пыл ад разбурэння, што цяпер носіцца ў паветры, асядзе, і нават можа здарыцца так, што ўжо будуць капаць вялізны катлаван пад фундамент для новага будынка. Потым уздымуцца тры сцяны, адна памежная з вуліцай, якой Сіпрыяну Алгору неўзабаве трэба будзе праехаць, астатнія абмяжуюць з двух бакоў тэрыторыю, утвораную прамежкавай вуліцай і знесенымі будынкамі, у выніку знікне фасад яшчэ бачнага будынка, дзверы для персаналу аховы будуць ужо ў іншым месцы, і праз колькі дзён нават самы праніклівы чалавек, гледзячы звонку і тым больш знаходзячыся ўнутры, не зможа адрозніць новую пабудову ад папярэдняй. Ганчар зірнуў на гадзіннік, было яшчэ рана, у дні, калі ён прывозіў зяця, нязменна да-

водзілася гадзіны дзве чакаць адкрыцця аддзела прыёмкі тавараў, мэты яго паездкі, а потым яшчэ нейкі час, пакуль не надыдзе яго чарга, Але ж я магу заняць добрае месца ў чарзе, нават магу быць першым, падумаў ён. Першым ён яшчэ ні разу не аказваўся, бо заўсёды нехта ўставаў раней за яго, хаця, хутчэй за ўсё, некаторыя кіроўцы проста бавілі частку ночы ў кабінах сваіх грузавікоў. Калі пачынала віднець, яны выходзілі вонкі з'есці хлеба з чым-небудзь і выпіць кавы, а сырой і халоднай раніцай дык і гарэлкі, потым заставаліся там і гаманілі, пакуль да адкрыцця варот не заставалася хвілін дзесяць, і тады маладзейшыя, нервовыя, як вучні, беглі па пандусе ўніз, да сваіх месцаў, у той час як старэйшыя, асабліва калі ім трэба было ў канец чаргі, ішлі, спакойна размаўляючы далей, наастатак зацягваючыся цыгарэтай, бо на падземным ярусе не дазвалялася курыць пры ўключаных рухавіках. Канец свету, лічылі яны, яшчэ не надышоў, і няма чаго бегчы.

Сіпрыяну Алгор завёў фургончык. Знос дамоў адцягнуў яго ўвагу, і цяпер ён хацеў нагнаць страчаны час, бязглуздыя словы з ліку іншых бязглуздых, недарэчны выраз, якім, як нам здаецца, мы можам падмануць жорсткую праўду, якая заключаецца ў тым, што нагнаць страчаны час нельга, быццам насуперак гэтай праўдзе верым, што створаны намі і страчаны назаўсёды час урэшце вырашыў спыніцца недзе там, ззаду, і з цярпеннем не абмежаванага ў часе чалавека чакае, што мы заўважым яго адсутнасць. Падштурхнуты раптоўнымі думкамі пра тое, хто пад'ехаў першым і хто пад'едзе пасля, ганчар хуценька зрабіў круг вакол квартала і выехаў на вуліцу, якая межавала з другім фасадам будынка. Згодна з нязменным звычаем там ужо стаялі людзі, чакаючы адкрыцця ўвахода для наведвальнікаў. Пераехаў на левую паласу, бліжэй да заезду на пандус, які вёў на падземны ярус, паказаў ахоўніку сваё пасведчанне пастаўшчыка і заняў месца ў чарзе за машынай, гружанай скрынкамі, што, як сведчылі налеп-

кі, змяшчалі шкляныя вырабы. Выйшаў з фургона, каб зірнуць, колькі пастаўшчыкоў перад ім, і больш-менш разлічыць працягласць чакання. Ён быў трынаццатым. Пералічыў яшчэ раз, ніякага сумнення. Хаця ганчар не быў прымхлівым чалавекам, пра кепскую рэпутацыю гэтай лічбы ведаў, у любой размове пра якуюсьці выпадковасць, фатальнасць і лёс нехта заўсёды бярэ слова, каб расказаць пра перажытыя моманты адмоўнага і часам пагібельнага ўздзеяння лічбы трынаццаць. Паспрабаваў успомніць, ці выпадала яму калі-небудзь раней такое месца ў чарзе, але адно з двух, або не, або проста не памятаў. Раззлаваўся сам на сябе, што за лухта, што за глупства, трывожыцца праз тое, чаго ў рэальным свеце не існуе, так, сапраўды, пра гэта ён ніколі раней не задумваўся, сапраўды нумароў у рэальнасці не існуе, рэчам усё адно, які нумар мы ім надаём, не мае аніякага значэння, назавём мы нешта трынаццатым ці сорак чацвёртым, найменшае, што можна заключыць, рэчы не могуць ведаць, на якім месцы ім давялося аказацца. Людзі не рэчы, людзі заўсёды жадаюць быць на першых месцах, падумаў ганчар. І не толькі быць там, але і каб пра гэта было сказана і каб астатнія гэта заўважылі, прамармытаў ён. За выключэннем двух ахоўнікаў, якія, кожны на сваім канцы, заўсёды назіралі за ўездам і выездам, падземны ўзровень быў бязлюдны. Так было заўсёды, па прыездзе кіроўцы пакідалі машыны ў чарзе і падымаліся на вуліцу выпіць кавы. Вы вельмі памыляецеся, калі думаеце, што я тут застануся, сказаў Сіпрыяну Алгор уголас. Здаў назад, нібыта яму, урэшце, нічога не трэба выгружаць, і выехаў з шэрага машын. Так я ўжо не буду трынаццатым, падумаў ён. Праз пару хвілін па пандусе з’ехаў грузавік і спыніўся на месцы, якое фургон пакінуў вольным. Кіроўца выйшаў з кабіны, зірнуў на гадзіннік. Час яшчэ ёсць, мабыць, падумаў ён. Калі яго ўжо не было бачна на пандусе, ганчар хуценька пад’ехаў і стаў за грузавіком, Цяпер я чатырнаццаты,

сказаў ён сабе, задаволены сваёй хітрасцю. Адкінуўся на сядзенні, уздыхнуў, над галавою гула вуліца, звычайна ён таксама падымаўся з іншымі, каб папіць кавы і купіць газету, але сёння яму не хацелася. Закрыў вочы, быццам занураючыся ў сябе, і адразу пачаў сніць сон, у якім зяць тлумачыў яму, што, калі яго прызначаць ахоўнікам з правам пражывання, сітуацыя рэзка зменіцца, яны з Мартай больш не будуць жыць у ганчарні, час ужо аддзяліцца і пачаць самастойнае жыццё, Зразумейце, чаму быць, як кажа прыказка, таго не абмінуць, свет не стаіць на месцы, калі людзі, ад якіх ты залежыш, павышаюць цябе па службе, табе толькі застаецца ўзняць рукі да неба і падзякаваць, было б недарэчным адвярнуцца ад удачы, калі яна на нашым баку, акрамя таго, я ўпэўнены, што больш за ўсё вы хочаце, каб Марта была шчаслівай, а таму будзеце задаволены. Сіпрыяну Алгор слухаў зяця і ўсміхаўся сам сабе, Ты кажаш усё гэта, бо думаеш, што я трынаццаты, ты ж не ведаеш, што я стаў чатырнаццатым. Прачнуўся ён раптоўна, ад стуку дзвярэй машын, знаку таго, што разгрузка вось-вось пачнецца. Потым, яшчэ знаходзячыся адной нагой у сне, падумаў, Мой нумар не змяніўся, я трынаццаты, які займае месца чатырнаццатага.

Так яно і было. Яго чарга падышла амаль праз гадзіну. Ганчар выйшаў з фургона і накіраваўся ў службу прыёму пастаўшчыкоў з заўсёднымі дакументамі, транспартная накладная ў трох экзэмплярах, рахунак за фактычна прададзеныя вырабы апошняй пастаўкі, даведка аб прамысловай якасці, якая суправаджае кожную партыю і згодна з якой ганчарня бярэ на сябе адказнасць за любы дэфект вырабу, выяўлены падчас абавязковага агляду посуду, пацверджанне эксклюзіўнасці, таксама абавязковае для кожнай пастаўкі, згодна з якім, каб пазбегнуць штрафных санкцый за парушэнне, ганчарня абавязваецца не мець гандлёвых стасункаў з іншай крамай для продажу сваіх вырабаў. Як звычайна, падышоў адзін супрацоўнік, каб

дапамагчы з разгрузкай, але намеснік начальніка службы падазваў яго і загадаў, Разгрузі палову прывезенага, правер па накладной. Сіпрыяну Алгор, здзіўлены і ўстрывожаны, спытаў, Палову, чаму, Апошнімі тыднямі продаж вельмі зменшыўся, мабыць, праз малы попыт нам давядзецца вярнуць вам тое, што на складзе, Вярнуць тое, што на складзе, Так, гэта абумоўлена кантрактам, Я добра ведаю, што гэта абумоўлена кантрактам, але ж, раз у ім таксама ўказана, што мне не дазволена мець іншых кліентаў, скажыце, каму я магу прадаць другую палову, Гэта не мая справа, я толькі выконваю атрыманы загад, Можна пагаварыць з начальнікам аддзела, Не, не варта, ён вас не прыме. Рукі ў Сіпрыяну Алгора дрыжэлі, ён неўразумела аглядваўся, шукаючы дапамогі, але не ўбачыў ніякай цікавасці на тварах трох кіроўцаў, што пад'ехалі пасля яго. І ўсё ж ён паспрабаваў выклікаць класавую салідарнасць, Не, вы толькі зірніце, чалавек прывозіць сюды плён сваёй працы, капаў гліну, мясіў яе, вырабіў замоўлены посуд, абпаліў яго ў печы, а яму кажуць, што возьмуць толькі палову тавару і вернуць тое, што на складзе, хацеў бы я ведаць, ці справядлівы такі ўчынак. Кіроўцы пераглянуліся, пацiснулі плячыма, не ведаючы, як адказаць лепш і каму гэта зрабіць, адзін з іх нават дастаў цыгарку, каб было ясна, што пытанне яго не цікавіць, але ўспомніў, што тут курыць нельга, павярнуўся спінай і схаваўся ў кабіне грузавіка, далей ад праблемы. Ганчар зразумеў, што, пратэстуючы, можа загубіць усю справу, і захацеў прытушыць агонь, які сам жа і распаліў, у любым разе прадаць палову ўсё ж лепш, чым нічога, неяк жа ўсё павінна вырашыцца, падумаў ён. Змірыўшыся, звярнуўся да намесніка начальніка, Можа, вы мне скажаце, чаму продаж так упаў, Мяркую, гэта звязана з паступленнем посуду з пластыку, які імітуе керамічны, імітуе так добра, што здаецца сапраўды керамічным, пры гэтым важыць значна меней і нашмат таннейшы, Гэта не прычына не купляць мой посуд, гліна

заўсёды гліна, прыродны, натуральны матэрыял, Скажыце гэта кліентам, я б не хацеў вас засмучаць, але мяркую, што з гэтага часу ваш посуд будзе цікавіць толькі калекцыянераў, ды і тых з кожным разам усё меней. Падлік скончыўся, намеснік начальніка запісаў у накладной, Атрымаў палову, і сказаў, Не прывозьце больш нічога, пакуль не атрымаеце ад нас паведамлення, Мяркуеце, што я магу прадоўжыць працу, спытаў ганчар, Гэта вам вырашаць, я не магу ўзяць на сябе такую адказнасць, А посуд, што на складзе, вы мне яго ўсё роўна вернеце, словы звінелі адчаем і такой горыччу, што той адказаў прымірэнча, Пабачым. Ганчар сеў у фургон, рэзка рвануў з месца, некалькі скрыняў, слаба замацаваных пасля частковай разгрузкі, саслізнулі і моцна ўдарыліся аб заднія дзверы, Хай яно ўсё разам лясне, раздражнёна выкрыкнуў ён. У пачатку пандуса ён мусіў спыніцца, рэгламент абавязвае паказаць пасведчанне і таму ахоўніку, такая вось бюракратыя, хаця ніхто не ведае навошта, сапраўды ж, хто пастаўшчыком заехаў, той пастаўшчыком і выязджае, але, падобна, ёсць выключэнні, вось, напрыклад, Сіпрыяну Алгор, які пры заездзе яшчэ быў пастаўшчыком, а цяпер, калі пагроза пацвердзіцца, можа ім і не застацца. Віна яўна кладзецца на нумар трынаццаць, хітрыкі з тым, каб паставіць пазней што было раней, лёс не ашукаюць. Фургон падняўся па пандусе, выехаў на дзённае святло, больш тут няма чаго рабіць, застаецца толькі ехаць дадому. Ганчар засмучана ўсміхнуўся, Нумар трынаццаць ні пры чым, трынаццаці не існуе, прыехаў бы я першым, прыгавор быў бы той самы, цяпер палова, потым будзе бачна, не жыццё, а выццё.

Кабета з баракаў, тая, што хацела новыя талеркі і гаршчкі, спытала мужа, Ну і як, бачыў фургон ганчарні, і муж адказаў, Так, прымусіў яго спыніцца, але потым адпусціў, Чаму ж, Калі б ты зірнула ў твар чалавека, які ў ім ехаў, далібог, і ты б так зрабіла.

Ганчар спыніў фургон, апусціў вокны з аднаго і другога боку і стаў чакаць якога-небудзь рабаўніка. Часта здараецца, што нейкі душэўны адчай, нейкія ўдары жыцця падштурхоўваюць ахвяру да такіх драматычных рашэнняў, як гэтае, калі не да горшых. Надыходзіць момант, калі ўзбураны ці абражаны чалавек чуе ў галаве голас, які крычыць яму, Ат, ужо няма чаго губляць, і тады, у залежнасці ад абставін, у якіх ён знаходзіцца, і месцам, дзе яны яго заспелі, ён альбо патраціць апошнія грошы на латарэйны білет, альбо кіне на гульнявы стол успадкаваны ад бацькі гадзіннік і атрыманую ад маці срэбную цыгарэтніцу, альбо паставіць усё, што мае, на чырвоны колер, хаця і бачыў, што той колер выпаў пяць разоў запар, альбо вылезе адзін з траншэі і кінецца з паднятым штыком на варожы кулямёт, альбо спыніць гэты фургон, апусціць шкло, потым адчыніць дзверы і будзе чакаць, што людзі з баракаў, са сваімі прывычнымі бітамі, заўсёднымі лёзамі і патрэбамі моманту, прыйдуць яго рабаваць, Калі яго дабра не захацелі тыя, то няхай забяруць гэтыя, такой была апошняя думка Сіпрыяну Алгора. Прайшло хвілін дзесяць, але ніхто не наблізіўся, каб учыніць жаданы рабунак, і чвэрць гадзіны праляцела, але нават валацужны сабака не выйшаў на шашу, каб памачыцца на кола і абнюхаць фургон, і толькі праз паўгадзіны з'явіўся ўрэшце нейкі брудны чалавек з непрыемным тварам, які спытаў у ганчара, Мо здарылася што, ці патрэбная дапамога, магу падштурхнуць, мабыць, акумулятар сеў. Ну вось, нават

калі ў самых моцных душ бываюць моманты неадольнай слабасці, калі цела не можа паводзіць сябе з той стрыманасцю і абачлівасцю, якім дух вучыў яго гадамі, не трэба здзіўляцца таму, што прапанова дапамагчы, ды яшчэ ад чалавека, што ўсім сваім выглядам нагадваў тыповага рабаўніка, закранула самую чуллівую струнку ў душы Сіпрыяну Алгора, у яго нават слязінка з'явілася ў куточку вока, Не, шчыра дзякую, сказаў ён, але калі добраахвотны памочнік ужо адыходзіў, выскачыў з фургона, хуценька адчыніў заднія дзверы і пазваў, Сеньёр, сеньёр, ідзіце сюды. Чалавек спыніўся, Дык усё-ткі дапамагчы, спытаў, Не, не гэта, Тады што, Ідзіце сюды, калі ласка. Чалавек падышоў, і Сіпрыяну Алгор сказаў, Вазьміце паўтузіна талерак, занясіце жонцы, гэта падарунак, і яшчэ паўтузіна гэтых, глыбокіх, Але ж я нічога не зрабіў, засумняваўся чалавек, Гэта няважна, усё роўна што зрабілі, а калі вам патрэбны збан для вады, то вось ён, Сапраўды, збан мне б у хаце спатрэбіўся, Дык бярыце, бярыце. Ганчар склаў талеркі, спачатку мелкія, потым глыбокія, потым гэтыя наверх на тыя, уладкаваў іх на выгіне левай рукі чалавека, а паколькі збан для вады ўжо вісеў у таго на правай руцэ, абдоранаму нават не было як выказаць удзячнасць, хіба што звычайным «дзякую», якое можа быць, а можа і не быць шчырым, ды нахілам галавы, што зусім не адпавядаў сацыяльнаму класу, да якога чалавек належаў, і мы б даведаліся нашмат больш пра складанасці жыцця, калі б узяліся за стараннае вывучэнне яго супярэчнасцей, а не трацілі процьму часу на асабовасці ды адпаведнасці, бо гэтыя павінны быць зразумелымі самі па сабе.

Калі чалавек, што выглядаў як рабаўнік, якім ён, зрэшты, не быў або гэтым разам проста не захацеў быць, збянтэжаны, знік сярод баракаў, Сіпрыяну Алгор завёў фургон і рушыў з месца. Відавочна, што нават самы вострый зрок не змог бы заўважыць хоць якое адрозненне ў ціску на спружыны і шыны фургона, калі вядзецца пра

вагу, то дванаццаць гліняных талерак і адзін збан для вады ў транспартным сродку, няхай сабе і сярэдніх памераў, гэта тое самае, што дванаццаць пялёсткаў белай ружы і адзін пялёстак чырвонай на шчаслівай галоўцы нявесты. Слова шчаслівай узнікла невыпадкова, сапраўды, гэта найменшае, што можна сказаць пра выраз твару Сіпрыяну Алгора, гледзячы на якога цяпер, ніхто б не паверыў, што ў яго прынялі толькі палову грузу, адвезенага ў Цэнтр. На жаль, калі праз два кіламетры ён заехаў у Прамысловы пояс, у памяці зноў усплыла яго цяжкая камерцыйная параза. Застрашлівы выгляд фабрычных комінаў, якія ванітавалі клубамі дыму, выклікаў у яго пытанне, на якой жа свалачной фабрыцы можа вырабляцца той свалачны пластыкавы падман, што зламысна імітуе гліну, Гэта немагчыма, прамармытаў ён, ні гук пластыку, ні вага не могуць быць як у гліны, а яшчэ ж ёсць сувязь паміж бачаннем і дотыкам, я недзе пра гэта чытаў, бачыць можна пальцамі, якія абмацваюць гліну, пальцамі, якія, нават не дакранаючыся да яе, могуць адчуць тое, што бачаць вочы. І, быццам душэўнай мукі было яшчэ мала, Сіпрыяну Алгор згадаў старую ганчарную печ і задаўся пытаннем, колькі талерак, гаршкоў, кубкаў і збаноў выкінуць за адну хвіліну тыя праклятыя машыны, колькі іншых рэчаў, што часам замяняюць збаны і кварты. Вынікам гэтых і іншых, незанатаваных, пытанняў стала тое, што твар ганчара зноў спахмурнеў, і з таго моманту і ўсю астатнюю дарогу ён толькі і думаў, што пра цяжкую будучыню, якая чакае сям'ю Алгораў, калі Цэнтр будзе настойваць на пераглядзе колькасці вырабаў, першай ахвярай якога, мабыць, і стала яго ганчарня. Аднак, да яго гонару, цалкам заслужанага, Сіпрыяну Алгор ні на міг не дазволіў сабе пашкадаваць пра шчодрасць у дачыненні да чалавека, які мог яго абрабаваць, калі праўда ўсё тое, што кажуць пра насельнікаў баракаў. На ўскраіне Прамысловага пояса віднелася некалькі сціплых майстэрань, што незразумела як выжылі

пры такой прагнасці да прасторы і разнастайнасці вырабаў сучасных фабрычных гігантаў, але факт заставаўся фактам, яны там былі, і магчымасць бачыць іх заўсёды цешыла душу Сіпрыяну Алгора, калі ў неспакойныя моманты жыцця яго апаноўвалі думкі пра будучыню сваёй прафесіі. Нядоўга ім трываць, падумаў, гэтым разам маючы на ўвазе майстэрні, а не будучыню ганчарнага рамяства, але толькі таму, што не паразважаў пра гэта даўжэй, так бывае часта, лічым магчымым сцвердзіць, што не варта чакаць высноў толькі таму, што вырашылі спыніцца на палове дарогі, якая б да іх прывяла.

Сіпрыяну Алгор хутка праехаў Зялёны пояс, не кінуўшы ніводнага позірку на палі, бо аднастайнае відовішча пластыкавых прастораў, цьмяных саміх па сабе і змрочных ад бруду, заўсёды рабіла на яго гнятлівае ўражанне, падумаць толькі, якім бы яно было сёння, калі б у гэткім настроі ён стаў сузіраць гэтую пустыню. Як таму, хто аднойчы прыўзняў блаславёную туніку якойсьці святой у алтары, каб даведацца, падтрымліваюць яе знізу чалавечыя ногі або пара дрэнна абструганых слупкоў, ганчару ўжо даўно не трэба было працівіцца спакусе спыніць фургон і пайсці зірнуць, ці праўда, што за тымі пакрыццямі і панелямі хаваюцца сапраўдныя расліны з пладамі, якія можна панюхаць, памацаць і кусануць, з лісцем, клубнямі і парасткамі, якія можна згатаваць, прыправіць і пакласці на талерку, альбо прыгнятальная меланхолія паверхні заразіла невылечнай штучнасцю ўсё, што расло ўнутры, чым бы яно ні было. Пасля Зялёнага пояса ганчар выехаў на другарадную дарогу, навакол цягнуліся ўбогія рэшткі ляску, нядбайна апрацаваныя палі, рачулка з цёмнай смярдзючай вадой, потым на адным павароце паказаліся руіны трох хат ужо без вокнаў і дзвярэй, з напалову праваленымі дахамі і ўнутранымі памяшканнямі, амаль паглынутымі расліннасцю, якая заўсёды прарываецца праз абломкі, нібыта ўжо была там, у чаканні свайго

часу, з самай закладкі падмуркаў. Паселішча пачыналася праз сотню метраў адсюль, яго перасякала шаша, на якую выходзілі некалькі вуліц, пляц няправільнай формы пукаціўся ў адзін бок, далей, у цяньку двух высокіх платанаў, стаяў закрыты калодзеж з помпай для пад'ёму вады і вялікім жалезным колам. Сіпрыяну Алгор памахаў рукой занятым размовай мужчынам, але насуперак сваёй звычцы спыняцца каля іх, вяртаючыся пасля дастаўкі вырабаў у Цэнтр, не спыніўся, у такі момант ён не ўяўляў, чаго яму хочацца, але ж яўна не размовы, няхай і са знаёмымі людзьмі. Ганчарня і хата, дзе ён жыў з дачкою і зяцем, месціліся на другім канцы паселішча, пасярод поля, убаку ад апошніх будынін. Ужо на ўездзе ў вёску Сіпрыяну Алгор знізіў хуткасць, а цяпер ехаў яшчэ павольней, дачка, мабыць, заканчвала гатаваць абед, час ужо, Як жа зрабіць, сказаць ёй адразу або пасля абеду, пытаўся ён у самога сябе, Лепш пасля, пастаўлю фургон у дрывотню, яна не пойдзе глядзець, ці прывёз я што, сёння ж не дзень закупак, так што зможам паесці спакойна, ну, гэта яна паесць спакойна, а я не, і ў канцы раскажу, што здарылася, альбо нават яшчэ пазней, калі ўжо будзем працаваць, бо даведацца пра непрыемнасць да абеду і адразу пасля яго аднолькава дрэнна. За паселішчам дарога рабіла шырокі паварот, пасля апошняга будынка ўдалечыні паўставала агромністая чорная шаўкоўніца вышынёй не менш за дзесяць метраў, там і знаходзілася ганчарня. Віно налітае, трэба піць, сказаў Сіпрыяну Алгор са стомленай усмешкай і падумаў, Лепш бы мяне гэтым віном званітавала. Павярнуў фургон налева, на дарогу з невялікім пад'ёмам, якая вяла да хаты, яшчэ на дарозе прасігналіў тры разы, так ён заўсёды абвяшчаў сваё вяртанне, дачка б здзівілася, калі б сёння ён так не зрабіў.

Хата і ганчарня былі пабудаваныя на прасторнай дзялянцы, ці то былым таку, ці то пляцоўцы, дзе мясілі гліну, пасярод якой у адзін далёкі дзень, пра які не засталo-

ся ні запісу, ні ўспаміну, дзед-ганчар Сіпрыяну Алгора з такім жа імем вырашыў пасадзіць шаўкоўніцу. Ганчарная печ, што знаходзілася трохі наводдаль, была больш сучасным тварэннем бацькі Сіпрыяну Алгора, якому далі тое самае імя, і замяніла сабой іншую печ, вельмі старую, каб не сказаць дапатопную, што мела форму двух усечаных, накладзеных адзін на адзін конусаў, верхні меншы, чым ніжні, пра паходжанне якой таксама не засталося ўспаміну. На яе старых падмурках была пабудаваная цяперашняя печ, дзе і быў абпалены посуд, ад якога Цэнтр пажадаў атрымаць толькі палову, а цяпер, ужо астылая, яна чакае, каб яе зноў загрузілі. З празмернай дбайнасцю Сіпрыяну Алгор паставіў фургон у дрывотню паміж двух кастроў з сухіх дроў, потым падумаў, што мог бы прайсці да печы і такім чынам прамарудзіць некалькі хвілін, але яму бракавала зачэпкі, бракавала абгрунтавання, сёння было не так, як у іншыя разы, калі ён вяртаўся з горада і печ працавала, у такія дні ён заглядваў у муфель і вызначаў тэмпературу па колеры распаленай гліны, ціператварыўся ўжо цёмна-чырвоны ў чырвона-вішнёвы, а той у аранжавы. Застаўся стаяць там, быццам патрэбны яму настрой затрымаўся дзесьці па дарозе, але голас дачкі вымусіў скрануцца з месца, Чаго ж не заходзіце, абед гатовы. Зацікаўленая прычынай такой марудлівасці, Марта паказалася на парозе, Ідзіце, ідзіце, а то абед астыне. Сіпрыяну Алгор увайшоў, пацалаваў дачку і зачыніўся ў ванным пакоі-прыбіральні, выгода, якая з'явілася ў хаце, калі ён быў падлеткам, і даўно патрабавала пашырэння і ўдасканальвання. Зірнуў на сябе ў люстэрка, не знайшоў на твары ніводнай новай зморшчыны, Яна пэўна ў маім нутры, падумаў ён, потым памачыўся, памыў рукі і выйшаў. Елі на кухні за вялікім сталом, што ведаў шчаслівейшыя дні і больш людныя застоллі. Цяпер, пасля смерці маці, Жушты Ізашкі, пра якую ў гэтым аповедзе наўрад ці будзе сказана нешта яшчэ, але імя якой тут напісана, бо проз-

вішча нам ужо вядомае, або садзяцца на адным канцы стала, бацька ў галаве, Марта на былым месцы маці, а насупраць яе Марсал, калі бывае тут. Як з'ездзіў, спытала Марта, Ну, як звычайна, адказаў бацька, нахіляючы галаву да талеркі, Марсал патэлефанаваў, Няўжо, і што ж ён хацеў, Сказаў, што гаварыў з вамі пра пераезд у Цэнтр, калі яго прызначаць ахоўнікам з правам пражывання, Так, была такая размова, Ён быў засмучаны, таму што вы, тата, зноў сказалі, што не згодны з гэтым, Потым я падумаў лепш, мяркую, гэта будзе неблагім рашэннем для вас абаіх, Як жа гэта вы так знянацку перадумалі, Ты ж не захочаш працаваць ганчаркай да канца сваіх дзён, Не, хаця мне падабаецца тое, што я раблю, Ты павінна быць побач з мужам, неўзабаве народзяцца дзеці, хопіць, што тры пакаленні елі гліну, А вы, тата, згодны пераехаць з намі ў Цэнтр, пакінуць ганчарню, спытала Марта, Пакінуць гэта, ніколі, такой гаворкі і быць не можа, Хочаце сказаць, што будзеце рабіць усё адзін, капаць гліну, мясіць яе, працаваць за варштатам і за ганчарным кругам, распальваць печ, загружаць, разгружаць і чысціць яе, а потым загружаць усё ў фургон і везці на продаж, напомню вам, што, нягледзячы на дапамогу Марсала за той кароткі час, што ён тут бывае, справы і так ідуць не надта добра, Знайду кагосьці, хто мне дапаможа, хлопцаў у паселішчы хапае, Вы добра ведаеце, што ніхто ўжо не хоча займацца ганчарствам, тыя, каму абрыдла поле, ідуць на фабрыкі Пояса, а не сыходзяць з зямлі, каб важдацца з глінай, Яшчэ адна прычына табе гэта кінуць, Вы ж не думаеце, што я вас тут пакіну аднаго, Калі-нікалі будзеш мяне наведваць, Тата, прашу вас, я сур'ёзна, Я таксама, дачушка.

Марта ўстала, каб памяняць талеркі і наліць суп, які сям'я мела звычку есці пад канец. Бацька сачыў за ёй вачыма і думаў, З такой гутаркай усё толькі ўскладняецца, лепш сказаць ёй цяпер. Але не зрабіў гэтага, дачка раптам стала васьмігадовай, а ён казаў ёй, Глядзі ўваж-

ліва, гэта робіцца так, як твая маці месіць цеста на хлеб. Ён качаў камяк гліны туды і сюды, сціскаў яго і расплясківаў тыльным бокам далоні, з сілай біў аб стол, размінаў, расціскаў, вяртаўся да пачатку, паўтараў усю аперацыю і раз, і два, і яшчэ раз, Чаму вы так робіце, тата, спытала яго дачка, Каб у гліне не заставалася камячкоў і бурбалачак паветра, гэта дрэнна для працы, І для хлеба таксама, Хлебу толькі камячкі шкодзяць, бурбалкі не маюць значэння. Адкладаў убок тугі валік, у які ператварылася гліна, і пачынаў мясіць наступны камяк, Час ужо табе навучыцца, сказаў ён тады, але потым пашкадаваў, Што за глупства, дзяўчу толькі восем гадкоў, і папраўіўся, Ідзі пагуляй на двары, ідзі, тут холадна, але дачка адказала, што ёй не хочацца ісці, яна намагалася вылепіць ляльку з рэшткаў гліны, якая прыліпала да пальчыкаў, бо была вельмі мяккай, Гэтая не падыходзіць, паспрабуй лепш тую, пабачыш, што атрымаецца, сказаў бацька. Марта глядзела з трывогай, не ў яго правілах было так схіляць галаву за ежай, быццам, хаваючы твар, ён хацеў схаваць і нейкія турботы, можа, гэта праз тую размову з Марсалам, але ж пра яе мы пагаварылі, і твар у яго быў зусім не такі, а можа, захварэў, нейкі ён як у ваду апушчаны, вялы, у той дзень маці сказала мне, Беражыся, не надрывайся, а я адказала ёй, Тут патрэбныя толькі моц рук і належны рух плячэй, астатняе цела дапамагае як рычаг, Ой, не кажы, у мяне нават валасы на галаве баляць пасля таго, як я цэлую гадзіну памяшу, Гэта толькі таму, што апошнім часам вы выглядаеце неяк больш стомленай, Або таму, што пачынаю старэць, Кіньце гэтыя думкі, мамачка, вы зусім не старая, але хто б мог падумаць, не прайшло і двух тыдняў пасля той размовы, як яна ўжо была мёртвая і пахаваная, вось такія неспадзяванкі смерць падносіць жыццю, Пра што вы думаеце, тата. Сіпрыяну Алгор выцер рот сурвэткай, узяўся за шклянку, нібыта збіраўся глынуць з яе, і паставіў зноў, не данёсшы да рота. Дык скажыце,

гаварыце, настойліва прамовіла дачка і, каб адкрыць яму дарогу да споведзі, спытала, Яшчэ турбуецеся праз Марсала ці ёсць іншая прычына для хвалявання. Сіпрыяну Алгор абхапіў шклянку, выпіў рэшткі віна адным глытком і адказаў так хутка, што, здавалася, словы апякалі яму язык, У мяне прынялі толькі палову грузу, кажуць, што стала меней ахвочых на вырабы з гліны, што ў продажы з'явіўся посуд з пластыку, які імітуе гліняны, і ён пакупнікам больш даспадобы, Гэтага трэба было чакаць, раней ці пазней мусіла здарыцца, гліняны посуд трэскаецца, б'ецца ад найменшага ўдару, краі аббіваюцца, а пластык усё вытрымлівае і не скардзіцца, Розніца ў тым, што кераміка, як і людзі, мае патрэбу ў добрым абыходжанні, Пластык таксама, хаця, вядома, менш, І самае кепскае, мне сказалі, каб не прывозіў больш посуду, пакуль яны не замовяць, Гэта значыць, спыняем працу, Не, спыняць не будзем, калі замова паступіць, у нас павінен ужо быць посуд, гатовы для адгрузкі ў той жа дзень, мы ж не пабяжым распальваць печ, атрымаўшы замову, А што нам рабіць да таго, Чакаць, набрацца цярпення, заўтра праеду па ваколіцы, хоць трохі ды прадам, Успомніце, што пару месяцаў таму вы ўжо аб'ехалі наваколле, наўрад ці знойдзецца шмат людзей, якія захочуць нешта набыць, Чаго ж ты мне збіваеш ахвоту, Я толькі імкнуся бачыць рэчы такімі, якія яны ёсць, гэта ж вы, тата, толькі што сказалі, што тры пакаленні ганчароў у сям'і гэта больш чым дастаткова, Ты не станеш чацвёртым пакаленнем, пераедзеш у Цэнтр са сваім мужам, Так, мушу пераехаць, але вы, тата, паедзеце са мною, Я ўжо казаў табе, што жыхаром Цэнтра ты мяне ніколі не ўбачыш, Цэнтр карміў нас да сённяшняга дня, закупляючы вынік нашай працы, і працягне карміць, калі мы там будзем жыць і не будзем мець што яму прадаваць, Дзякуючы заробку Марсала, Гэта не зняважа, калі зяць утрымлівае цесця, Залежыць ад таго, які цесць, Тата, нядобра быць такім ганарыстым, Рэч не ў гонары, У чым та-

ды рэч, Цяжка растлумачыць, гэта нешта складанейшае за гонар, нешта іншае, накшталт сораму, але прабач мне, прызнаю, што не варта было гаварыць тое, што я сказаў, Я толькі не хачу, каб вы аказаліся ў цяжкім становішчы, Пачну прадаваць гандлярам у горадзе, патрэбны толькі дазвол Цэнтра, калі ён набывае менш, то не мае права забараніць мне продаж іншым кліентам, Вам вядома лепш, чым мне, што гарадскія гандляры перажываюць вялікія цяжкасці, каб утрымацца на плаве, усе людзі робяць пакупкі ў Цэнтры, усё больш і больш людзей хоча жыць у Цэнтры, Я не хачу, Што вы будзеце рабіць, калі Цэнтр перастане набываць наш посуд, а мясцовыя пачнуць карыстацца пластыкавым начыннем, Спадзяюся памерці да гэтага, Маці памерла да гэтага, Памерла за ганчарным кругам, за працай, хацеў бы і я скончыць сваё жыццё так, Не гаварыце пра смерць, тата, Пра смерць мы можам гаварыць толькі пакуль жывыя, а не потым. Сіпрыяну Алгор наліў сабе яшчэ трохі віна, устаў з-за стала, выцер рот тыльным бокам далоні, быццам правілы паводзін за сталом перасталі дзейнічаць з канцом абеду, і сказаў, Пайду нарыхтоўваць гліну, тая, што ёсць, ужо заканчваецца. Калі ён выходзіў, дачка паклікала яго, Тата, у мяне з'явілася думка, Думка, Так, патэлефанаваць Марсалу, каб ён пагутарыў з начальнікам аддзела закупак і паспрабаваў даведацца пра намеры Цэнтра, гэтае скарачэнне замоваў на кароткі час ці, наадварот, надоўга, тата, вы ведаеце, што начальства паважае Марсала, Прынамсі, ён так кажа, Калі ён так кажа, так яно і ёсць, нецярпліва парыравала Марта і дадала, Але калі вы супраць, я не буду яму званіць, Пазвані, так, пазвані, думка неблагая, да таго ж на гэты момант адзіная, хаця я і сумняваюся, што начальнік аддзела Цэнтра без нічога ніякага пагодзіцца даць тлумачэнні наконт сваёй працы нейкаму ахоўніку другой катэгорыі, я ведаю іх лепш, чым Марсал, не трэба там знаходзіцца, каб зразумець, з якога цеста зробленыя тыя

людзі, лічаць сябе пупам зямлі, акрамя таго, начальнік аддзела ўсяго толькі падначалены, выконвае загады, якія прыходзяць зверху, можа нават здарыцца, што ён нам дасць хлуслівыя, беспадстаўныя тлумачэнні, абы толькі паказацца важнай фігурай. Марта выслухала шматслоўную тыраду да канца, але нічога не адказала. Паколькі бацька, відаць, прагне пакінуць за сабою апошняе слова, яна не пазбавіць яго такога задавальнення. Калі ён выйшаў, падумала толькі, Мне трэба быць больш чулай, трэба стаць на яго месца, уявіць, што значыць застацца раптам без працы, пакінуць хату, ганчарню, печ, жыццё. Паўтарыла ўголас апошняе слова, Жыццё, і яе вочы раптам затуманіліся, яна ўбачыла сябе на яго месцы і адчула тыя самыя пакуты. Агледзелася і ўпершыню заўважыла, што ўсё нібыта пакрытае глінай, не бруднае ад гліны, а толькі колеру гліны, колеру ўсіх яе колераў, калі яе бралі з гліншча, колеру, што пакінулі пасля сябе тры пакаленні, якія кожны дзень пэцкалі рукі ў гліняным пыле і вадзе, і таксама на двары, насычаны шэры колер печы з яе апошнім сыходным цяплом, калі яе пакідалі пустой, як тая хата, з якой гаспадары выйшлі і якая застаецца цярпліва чакаць, а заўтра, калі ўсяму гэтаму яшчэ не прыйшоў поўны канец, зноўку першы язык полымя ад падпаленых дроў, першы гарачы подых, які пяшчотна абдыме сухую гліну, а потым, пакрысе, трымценне паветра, мігаценне вуголля, успышка ззяння, асляпляльнае вывяржэнне агню ва ўсёй яго сіле. Калі мы паедзем адсюль, я гэтага больш ніколі не ўбачу, прамовіла Марта, і сэрца яе сціснулася, быццам яна развітвалася з самым любімым чалавекам, хаця ў той момант яна б не змагла сказаць, хто гэты чалавек, ці то маці-нябожчыца, ці то бацька ў скрусе, ці то нават муж, так, напэўна, муж, гэта найбольш лагічна, яна ж яго жонка. Чула глухі стук доўбні, што драбіла гліну, стук нібыта ішоў аднекуль з-пад зямлі, але сёння гук удараў здаваўся ёй іншым, магчыма, таму, што іх прычынай бы-

ла не простая патрэба ў працы, а бяссільная злосць ад магчымасці страціць яе. Пайду патэлефаную, прамармытала Марта сама сабе, калі буду пра ўсё гэта думаць, сама засмучуся, як ён. Выйшла з кухні і накіравалася ў бацькаў пакой. Там, на малым століку, дзе Сіпрыяну Алгор занатоўваў расходы і даходы ганчарні, стаяў старамодны тэлефонны апарат. Набрала адзін з нумароў камутатара і папрасіла, каб яе звязалі са службай аховы. Амаль у той жа момант прагучаў сухі мужчынскі голас, Служба аховы, хуткасць адказу не здзівіла яе, усе ведаюць, што ў пытаннях бяспекі важным можа аказацца нават самая нязначная з секунд, Я б хацела пагаварыць з ахоўнікам другога класа Марсалам Гашу, сказала Марта, А вы хто, Я яго жонка, званю з дому, Ахоўнік другога класа Марсал Гашу цяпер знаходзіцца пры выкананні службовых абавязкаў і не можа пакінуць сваё месца, У такім выпадку перадайце яму, калі ласка, паведамленне, Вы яго жонка, Так, маё імя Марта Алгор Гашу, можаце праверыць, Тады вы павінны ведаць, што мы не перадаём паведамленні, а толькі запісваем, хто патэлефанаваў, Яму толькі трэба сказаць, каб патэлефанаваў дадому пры першай магчымасці, Штосьці неадкладнае, спытаў голас. Марта задумалася, ці неадкладная яе справа, папраўдзе, неадкладнай яе не назавеш, нічога не гарыць, сур'ёзных праблем з печчу ніякіх, а пра датэрміновыя роды і казаць няма чаго, але ўрэшце адказала, Так, сапраўды, у пэўным сэнсе неадкладнае, Я запісаў, сказаў чалавек і адключыўся. З уздыхам стомленай пакоры Марта паклала слухаўку, што тут зробіш, гэта мацнейшае за іх, служба бяспекі не можа жыць, не дэманструючы людзям сваю ўладу, нават у такім банальным выпадку, як гэты, такі звычайны, такі паўсядзённы, чыясьці жонка патэлефанавала ў Цэнтр, таму што мела патрэбу пагаварыць з мужам, не была яна першай і апошняй яўна не будзе. Калі Марта выйшла на двор, ёй раптоўна перастала здавацца, што ўдары доўбні чуваць з-пад зямлі, іх

гук ішоў адкуль і павінен быў ісці, з цёмнага кутка ганчарні, дзе захоўвалася здабытая ў глінішчы гліна. Наблізілася да дзвярэй, але парога не пераступіла, Патэлефанавала ўжо, сказала, яму паведамяць, Будзем спадзявацца, што так, адказаў бацька і без лішніх слоў атакаваў доўбняй самы вялікі з кавалкаў гліны, што грувасціліся перад ім. Марта павярнулася спінай, бо ведала, што не можа зайсці ў месца, якое бацька выбраў наўмысна, каб пабыць там адзін, ды і ёй самой трэба было працаваць, некалькі тузінаў вялікіх і малых гаршкоў чакалі, каб ім прырабілі ручкі. Увайшла праз суседнія дзверы.